За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 4 (99) 10-19 лютага 2015 г.


Праваабаронца Павал Левінаў зьвярнуўся ў пракуратуру наконт пакараньняў за фотасэсію

У Віцебску працягваецца змаганьне за права фатаграфавацца на вуліцах гораду: праваабаронца Павал Левінаў напісаў скаргу ў пракуратуру наконт штрафаў за фотасэсію на фоне графіці "з птушкамі і клеткамі". Гарвыканкам даслаў яму пісьмовы адказ, што фотасэсія ня лічыцца масавым мерапрыемствам.

У скарзе на імя пракурора Віцебскай вобласьці Павал Левінаў піша, што Рэспубліка Беларусь на дзяржаўным узроўні мусіць гарантаваць кожнаму грамадзяніну захаванасьць ягоных правоў. Таму ён лічыць, што суд Чыгуначнага раёну, аштрафаваўшы яго на 25 базавых велічынь за ўдзел у фотасэсіі як за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, парушыў адразу некалькі ягоных правоў: права на мірныя сходы, на выказваньне сваіх меркаваньняў і на свабоду карыстацца сваімі правамі як асобы, дзеяньні якой не нясуць аніякае шкоды людзям або дзяржаўным інтарэсам.

Ён згадвае, што штраф, прысуджаны судзьдзёй Аленай Цыганковай, не атрымалася аспрэчыць ні ў абласным судзе, ні пасьля звароту да старшыні абласнога суду. Усе судовыя структуры і службоўцы сышліся на тым, што ў лістападзе 2014 году віцебскія журналісты і актывісты правялі несанкцыянаваную акцыю, калі сфатаграфаваліся на фоне графіці – выяваў трох клетак, зь якіх на волю вылятаюць птушкі. Шасьцёра ўдзельнікаў фотасэсіі былі аштрафаваныя, яшчэ адзін адбыў трое сутак арышту ў ізалятары часовага ўтрыманьня.

На думку праваабаронцы, сытуацыя атрымалася бязглуздая: "Паводле суду, кожны грамадзянін мусіць прасіць дазволу ва ўладаў, каб сфатаграфавацца ў тым ці іншым месцы. Гэта ненармальна! Але тую самую выснову падтрымала і Чыгуначная раённая адміністрацыя: я зьвярнуўся па дазвол на фотасэсію, падобную да той, што адбылася з маім удзелам у лістападзе. Атрымаў адмову за подпісам намесьніцы старшыні Ляпёшкінай. Абскардзіў яе ў гарвыканкаме, і атрымаў адтуль за подпісам намесьніка старшыні гарвыканкаму Ўладзімера Шломы адказ зусім іншага зьместу. Маўляў, фатаграфаваньне не ўваходзіць у пералік імпрэзаў, пералічаных у заканадаўстве аб масавых мерапрыемствах. Адпаведна, ні па якія дазволы зьвяртацца ня трэба. Тым ня менш сямёра ўдзельнікаў лістападаўскай фотасэсіі засталіся пакараныя! Я буду спрабаваць абскардзіць рашэньне пра штраф, якое тычыцца мяне, і ў выпадку посьпеху я дапамагу бараніцца кожнаму, хто трапіў у такое самае становішча".



Павал Левінаў

Павал Левінаў зьвяртаўся ў абласную пракуратуру двойчы. Уласна са скаргай на парушэньне законнасьці і сваіх правоў, і з дадаткам да скаргі. У другім дакумэнце ён спасылаецца на выказваньні Аляксандра Лукашэнкі падчас прэсавай канферэнцыі 29 студзеня 2015 году — пра тое, што міліцыя дарма выказвала прэтэнзіі да грамадзян, якія мірным шляхам выказвалі сваё стаўленьне да забойства французскіх журналістаў, супрацоўнікаў часопіса "Charlie Hebdo". 4 лютага мусілі разглядаць адміністрацыйныя справы ў дачыненьні да лідэра АГП Анатоля Лябедзькі, намесьніка старшыні партыі "Зялёных" Дзьмітрыя Кучука і Паўла Канавальчыка. Яны прыйшлі да амбасады Францыі з плякатамі "Я — Шарлі", каб далучыцца да сусьветнай хвалі салідарнасьці з расстралянымі супрацоўнікамі парыскага часопісу. Удзельнікаў акцыі затрымалі і склалі на іх пратаколы. Але працэсы былі адмененыя.

Павал Левінаў перакананы, што і пакараньні ўдзельнікам фотасэсіі ў Віцебску варта адмяніць, бо яны не рабілі нічога такога, што магло б нанесьці шкоду. Наадварот, лічыць праваабаронца, шкоду аўтарытэту Рэспублікі Беларусь нанёс маёр міліцыі Аляксандар Рыбакоў, які склаў на ўдзельнікаў фотасэсіі адміністрацыйныя пратаколы, і пра гэтыя парушэньні правоў асобы стала вядома далёка за межамі краіны. Замежныя журналісты нават правялі ў Брусэлі акцыю дзеля падтрымкі віцебскіх калег – яны таксама сфатаграфаваліся з папяровымі кветкамі і птушкамі, зробленымі з газэты. А яшчэ трымалі ў руках шыльдачкі з надпісам "Хіба гэта злачынства?"

Камітэт ААН па правох чалавека зарэгістраваў скаргу распаўсюдніка газэты «Віцебскі кур'ер»


Міхаіл Жураўлёў

Праваабаронца Павал Левінаў атрымаў паведамленьне пра тое, што скарга **распаўсюдніка газэты «Віцебскі кур'ер» Міхаіла Жураўлёва** зарэгістраваная. Упраўленьне Вярхоўнага Камісара па правох чалавека ААН праінфармавала пра рэгістрацыю пад нумарам 2495/2014 пададзенага на разгляд КПЧ паведамленьня згодна з Факультатыўным пратаколам да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох.

Гэтае паведамленьне было падрыхтаванае праваабаронцам у інтарэсах Міхаіла Жураўлёва.

Як была справа: спачатку супрацоўнікамі міліцыі аддзелу ўнутраных спраў адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску ў дачыненьні да Міхаіла Жураўлёва быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні за незаконны, на іх думку, распаўсюд газэты «Віцебскі Кур'ер».

Потым судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Натальля Кораблина, ня доўга разьбіраючыся, падвергла Міхаіла Жураўлёва адміністрацыйнаму штрафу, што ў 1,5 разы перавышае памер пэнсіі, якую ён атрымлівае. Удзячныя чытачы «Віцебскага Кур'еру» сабралі неабходную суму і дапамаглі Міхаілу выплаціць штраф.

Абскарджаньне вышэй не дапамагло: судзьдзя Віцебскага абласнога суду Ірына Смалякова, таксама як і старшыня гэтага суду Мікалай Хамічонак ня ўгледзелі падстаў да скасаваньня вынесенай пастановы. Абскарджаньне яшчэ вышэй таксама не прынесла выніку: і намесьнік старшыні Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь Валер Калінковіч застаўся глухі да довадаў Міхаіла Жураўлёва.

Спрабаваў быў Міхаіл Жураўлёў адстаяць сваё права ў Камісіі па правох чалавека Садружнасьці Незалежных Дзяржаў, але высьветлілася, што Камісія гэтая дагэтуль ня створаная і правоў грамадзян СНД абараніць ня можа.

«Прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці за выказваньне свайго меркаваньня праз распаўсюд інфармацыі з дапамогай друку парушыла права Міхаіла Жураўлёва, гарантаванае артыкулам 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох. Накладаньне адміністрацыйнага спагнаньня за распаўсюд інфармацыі ёсьць ня што іншае, як ухіленьне Рэспублікі Беларусь у асобе вышэйпералічаных судзьдзяў і структур ад узятых забавязаньняў па недапушчальнасьці зьдзяйсьняць дзеяньні, накіраваныя на зьнішчэньне правоў і свабод, прадугледжаных пактам», — мяркуе праваабаронца Павал Левінаў.

Цяпер слова за кампэтэнтным міжнародным органам.

У ВІЦЕБСКУ ЎЛАДЫ І... МЭДЫКІ ЗНОЎ САРВАЛІ ПІКЕТЫ


Ян Дзяржаўцаў

Ізноў у Віцебску не адбыліся пікеты, заяўкі на правядзеньне якіх падавалі мясцовыя апазыцыянэры. Чыноўнікі раённых адміністрацыяў гораду патлумачылі свае рашэньні пра забароны пікетаў стандартна: арганізатары акцыяў ня выканалі рашэньне гарвыканкаму пра дамовы на абслугоўваньне акцыяў са службай ЖКГ, міліцыянтамі і мэдыкамі. Апошнія ж ад заключэньня неабходных дамоваў ізноў ухіліліся...

Заяўкі на пікеты (па адной у кожную з трох раённых адміністрацыяў Віцебску) падавалі пяцёра сяброў КХП-БНФ. Усе пікеты мусілі ладзіцца ў розны час 10 лютага. Іх мэта: давесьці грамадзянам, што знаходжаньне Беларусі ў Эўразійскім эканамічным саюзе стане асновай для страты дзяржаўнага сувэрэнітэту краіны, прывядзе да далейшага зьнішчэньня беларускай мовы, гісторыі і культуры беларускай дзяржавы.

Апроч заявак на пікеты, падаваліся таксама заявы пра заключэньне патрэбных дамоваў генэральнаму дырэктару УКВП «Віцебская гарадзкая жыльлёва-камунальная гаспадарка», ва Ўпраўленьне ўнутраных спраў Віцебскага абласнога выканаўчага камітэту ды ва ўстанову аховы здароўя «Віцебская гарадзкая цэнтральная паліклініка». Згодна з рашэньнем гарвыканкаму, прынятым у 2009 годзе, такія дамовы трэба мець абавязкова, каб прэтэндаваць на атрыманьне дазволу ад мясцовых уладаў на правядзеньне якога-кольвек масавага мерапрыемства.

Заключыць дамову з апазыцыянэрамі пагадзіліся толькі камунальнікі. Зь міліцыі паведамілі, што будуць ахоўваць парадак падчас пікетаў, але толькі калі ўлады дадуць дазволы на іх правядзеньне. Самым жа катэгарычным аказалася кіраўніцтва УАЗ «Віцебская гарадзкая цэнтральная паліклініка»: Каардынаваць загадзя дзейнасьць мэдычных брыгад установы на дату меркаванага мерапрыемства не ўяўляецца магчымым, таму не ўяўляецца магчымым заключыць дамовы, — напісаў, адказваючы на заяву, галоўны лекар паліклінікі Станіслаў Цітовіч.

Ад моманту прыняцьця Віцебскім гарвыканкамам рашэньня аб неабходнасьці заключаць нейкія дамовы − цягам блізу пяці гадоў − у Віцебску не было дазволена ніводнай акцыі апазыцыі. Менавіта адсутнасьцю дамоваў з патрэбнымі службамі мясцовыя ўлады зазвычай абгрунтоўваюць свае забароны на правядзеньне акцыяў.

Але гэтым разам яны праявілі крэатыўнасьць і дадалі яшчэ адзін пункт у абгрунтаваньне забаронаў пікетаў. Яну Дзяржаўцаву, аднаму з заяўнікаў, чыноўнікі паведамілі, што цягам апошняга году ён прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасьці за парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў, таму, маўляў, быць заяўнікам ня можа.

Сябра КХП-БНФ Ян Дзяржаўцаў такім адказам абураны, бо заяўкі на правядзеньне пікетаў падпісалі яшчэ чацьвёра яго аднапартыйцаў, якія нічога не парушалі. Таксама Ян Дзяржаўцаў абураны тым фактам, што з адной з адміністрацыяў − Першамайскага раёну − адказ прыйшоў на расейскай мове, хаця заяўка падавалася па-беларуску. Гэта зьяўляецца парушэньнем Закону аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, і апазыцыйны актывіст ужо падрыхтаваў адпаведныя скаргі ў пракуратуру і аблвыканкам.

Умовы ўтрыманьня ў Віцебскім СІЗА



***Установа «Сьледчы ізалятар № 2» (СІЗА № 2) упраўленьня Дэпартамэнту выкананьня пакараньняў МУС Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласьці, г. Віцебск.* Праваабаронцам са словаў людзей, чые сваякі і знаёмыя знаходзяцца ў СІЗА № 2, стала вядома пра тое, што ў гэтай установе існуюць пэўныя адхіленьні ад зацьверджаных нормаў утрыманьня. І хаця атрыманую інфармацыю праверыць не ўдалося, мы вырашылі яе апублікаваць.**

• Памяшканьне для наведвальнікаў і прыёму перадач мае недастатковую плошчу (3,5х4 м), і не зьмяшчае ўсіх ахвотных (у выходныя дні колькасьць наведвальнікаў дасягае ад 30 да 50 чалавек).

• У пакоі сустрэч і перамоваў маецца толькі 3 месцы. Пры працягласьці перамоваў максымум 3 гадзіны шмат хто з ахвотных ня могуць сустрэцца з тымі, хто зьмяшчаецца ва ўстанове. Таму чаргу для сустрэч даводзіцца займаць а 6-й гадзіне раніцы або нават яшчэ раней.

• Перадача лекаў ад нядаўняга часу ажыцьцяўляецца толькі з дазволу начальніка мэдычнай часткі. Раней перадача лекавых сродкаў ажыцьцяўлялася свабодна.

• На другім паверсе ўстановы, у мужчынскім аддзяленьні, дрэннае ацяпленьне (тэмпэратура ў камэрах ўтрыманьня ніжэй за норму). У гэтай сытуацыі ўвядзеньне абмежавальных нормаў перадачы зьмешчаным у СІЗА цёплай вопраткі ёсьць непрымальным.

• Мыцьцё зьмешчаных у СІЗА ў душавым пакоі кароткачасовае (да 15 хвілін), а гэтаксама дрэнная рэгуляваньне халоднай і гарачай вады, што не дазваляе паўнавартасна памыцца.

• Бібліятэка ўтрымлівае абмежаваную колькасьць кніг, у лік якіх уваходзяць у асноўным творы клясыкаў расейскай і савецкай літаратуры. Бракуе Кодэксаў, неабходных зьмешчаным у СІЗА для падрыхтоўкі да судовых працэсаў.

ПАМЯТКА: Што браць з сабой у СІЗА

1. Талерка (плястмасавая), у кожным разе не шкляная і не зялезная, лепш якая закрываецца накшталт тэрма

2. Конаўка або кубак (плястмасавая), у кожным разе не шкляная і не зялезная, лепш якая закрываецца накшталт тэрма

3. Плястмасавая лыжка

4. Кіпяцільнік (пажадана некалькі штук, бо хутка выходзяць з ладу)

5. Мыла

6. Шампунь

7. Зубныя шчотка і паста

7. Пральны парашок (гаспадарчае мыла)

8. Ручнік

9. Брытва — аднаразовыя станкі або электрычная

10. Сродкі гігіены, крэмы, ватовыя палачкі, крэмы для і пасьля галеньня (толькі ў цюбіках!), касмэтычка

11. Сшытак, канпэрты, маркі, налепкі, фатаграфіі, фотаальбомы

12. Асадка

13. Кніга

14. Цыгарэты — своеасаблівая валюта, яе вартасьць вызначаецца коштам цыгарэт на волі

15. Гарбата

16. Кава

17. Цукар

18. Цукеркі

19. Шакаляд

20. Печыва

21. Сухая кілбаса, сала

22. Цыбуля, часнык

23. Камячкі, сухая бульба, якія не патрабуюць варкі

24. Тапкі-шлёпанцы плястмасавыя, гумовыя, скураныя, толькі не забывайцеся, што ў гэтых тапках Вы будзеце хадзіць і ў душ

25. Любы абутак для выхаду на двор, абавязкова без шнуркоў і супінатараў (шнуркі адбяруць, супінатары вырвуць)

26. Адзеньне, у якім зручна як ляжаць на нарах, так і хадзіць на допыты, шпацыр:

— Спартыўны касьцюм

— Саколкі

— Швэдар

— Штаны (спадніцу)

— Цёплыя шкарпэткі

— Калі справа адбываецца ў халодны час году — зручная і цёплая верхняя вопратка, шалік, пальчаткі

Усе прадукты і рэчы павінны быць перасыпаныя, перакладзеныя ў празрыстыя пакеты, інакш непразрыстая ўпакоўка будзе разарваная, усё будзе рассыпанае проста на падлогу! Добра мець пры сабе некаторую колькасьць празрыстых пакетаў, на ўсяlякі выпадак!

Усё, што ў Вас ёсьць з сабой, павінна быць выкладзена ў адну трывалую торбу, якая надзейна зашпільваецца!

Полацак: Выказваць меркаваньне забаронена



Мікалай Шарах

Полацкі раённы выканаўчы камітэт 12 лютага забараніў рабочым заводу «Шкловалакно» публічна выказаць сваё меркаваньне наконт новых патрабаваньняў Дэкрэту нумар пяць. Пра гэта пісьмова паведаміў намесьнік старшыні выканкаму Пётар Пяткевіч арганізатарам пікету. Адмова абгрунтоўваецца тым, што заяўнікамі «не былі заключаныя дамовы» зь міліцыяй і гарадзкім шпіталем.

Рабочыя лічаць абсурдам, што для выказваньня свайго меркаваньня неабходна аплаціць працу міліцыянтаў і лекараў. «Пакуль яшчэ хуткая дапамога і міліцыя прыяжджаюць па выкліку бясплатна...» — кажуць рабочыя.

Правядзеньне пікету (стаяньне з плякатамі) на знак пратэсту супраць дэкрэту №5 прызначанае на 21 лютага ў шмат якіх гарадох Беларусі. Рашэньне аб правядзеньні масавых пратэстаў прыняў Беларускі Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў. У Полацку заяўка аб дазволе на пікет да мясцовых уладаў падавалася 5 лютага ад імя грамадзян, рабочых «Шкловалакна». Рабочыя ўзялі на сябе забавязаньне самастойна забясьпечваць парадак падчас правядзеньня пікету і лічаць, што няма неабходнасьці ў заключэньні платных дамоваў з гарадзкімі службамі на абслугоўваньне пікету.

Памочнік майстра заводу «Шкловалакно» Мікалай Шарах, намесьнік старшыні Свабоднага прафсаюзу Беларускага: «Мы ня лічым неабходным дадаткова аплачваць працу гарадзкіх службаў, і ў іх паслугах пры правядзеньні пікету мы не маем патрэбы. Абмежаваньне права рабочых у выказваньні свайго меркаваньня на новаўвядзеньні дэкрэту №5 лічым парушэньнем закону, неабгрунтаваным абмежаваньнем правоў рабочых. Такое рашэньне райвыканкаму робіць права працоўных на мірны сход ілюзорным».

Пікет прызначаўся для збору подпісаў пад зваротам да **прэзыдэнта прыпыніць дзеяньне дэкрэту**. Асаблівае абурэньне рабочых заводу выклікала норма дэкрэту №5, якая дазволіць начальнікам ўжываць да працоўных новую меру дысцыплінарнага спагнаньня — пазбаўленьне прэміяльных на тэрмін аж да дванаццаці месяцаў. Улады маюць ілюзію, што гэта падвысіць працоўную дысцыпліну.

Падчас напісаньня дэкрэту яго нормы не абмяркоўваліся ў прадстаўнічых органах улады. Больш таго, не абмяркоўвалася дэкрэт і ў **Савеце па пытаньнях удасканаленьня заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сфэры**, які адмыслова створаны пры Міністэрстве працы менавіта для такіх абмеркаваньняў.

Гэты савет фармуецца з прадстаўнікоў прафсаюзных аб'яднаньняў, аб'яднаньня наймальнікаў і органаў дзяржаўнага кіраваньня. Паседжаньне вядзе міністар працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна Шчоткіна. З 23 студзеня ў савет ад дэмакратычных прафсаюзаў уваходзяць старшыня Беларускага Незалежнага прафсаюзу Мікалай Зімін, намесьнік старшыні БКДП Сяргей Антусевіч і намесьнік старшыні Свабоднага прафсаюзу Беларускага, работнік заводу ААТ «Полацак-Шкловалакно» Мікалай Шарах.

На “Нафтане” не зьбіраюцца падвышаць заробкі

На наваполацкім нафтаперапрацоўчым заводзе "Нафтан" не плянуюць павышаць заробкі пэрсаналу як мінімум у найбліжэйшыя паўгоду. Пра гэта паведаміў гендырэктар прадпрыемства Уладзімер Трацьцякоў, адказваючы на пытаньні работнікаў заводу.

Супрацоўнікі НПЗ канстатавалі, што пры павелічэньні тарыфнай стаўкі 1-га разраду іх даходы павялічыліся прыкладна на 10%, а ў даляравым эквіваленце за апошнія пару месяцаў яны паменшыліся прыблізна на 30%. Адказваючы на пытаньне, на працягу якога пэрыяду даходы могуць хаця б вярнуцца на ранейшы ўзровень у даляравым эквіваленце, Трацьцякоў паскардзіўся на некарэктнасьць такой прывязкі. "Мы з вамі жывём і працуем у Рэспубліцы Беларусь, дзе дакладна вызначаныя крытэры памеру нашай заработнай платы. Ніколі яна ня будзе разьлічвацца ў даляравым эквіваленце. І даляр афіцыйна не дазволены як плацельны сродак для фізычных асоб", — сказаў ён.

Разам з тым, Уладзімер Трацьцякоў адзначыў, што "ў беларускіх рублях за мінулы час наша зарплата значна вырасла". Але "прывязваць яе да даляравага эквіваленту ніхто не плянуе ні на ўзроўню дзяржавы, ні на ўзроўню прадпрыемства". "Сёньня важна захаваць хаця б тыя пазыцыі, якія існуюць. Калі хтосьці разьлічвае на большае, то хачу адразу сказаць: у найбліжэйшай, як мінімум паўгадавой, пэрспэктыве такіх магчымасьцяў не праглядаецца. А што будзе далей — цяжка прагназаваць", — рэзюмаваў ён.

Паводле зьвестак Белстату за сьнежань, сярэдні заробак у нафтанцы быў 12,8 мільёну рублёў.

На "Нафтан-Паліміры" працуюць каля 12 тысяч чалавек.

У сувязі з падатковым манэўрам у Расеі кошт нафты для беларускіх НПЗ вырас. Паводле ацэнак экспэртаў, на 100 даляраў за тону. Урад, каб неяк кампэнсаваць гэтыя выдаткі, ужо зьнізіў кошт ставак акцызаў на 20-22%. Апроч таго, у сярэдзіне студзеня былі падвышаны ў сярэднім на 5% раздробныя кошты на бэнзін і дызпаліва. Плюс да ўсяго, "Нафтан", да якога далучаны і завод "Палімір", сур'ёзна субсідуе ўвесь нафтахімічны комплекс Беларусі. "У асобныя месяцы аб'ёмы падтрымкі дасягалі 12 мільёнаў эўра", — распавяла аглядальнік газэты "Беларусы і рынак" Тацьцяна Манёнак. Экспэрты таксама зьвяртаюць увагу на неабходнасьць фарсаваць мадэрнізацыю беларускіх НПЗ, якія і так істотна закрэдытаваныя.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.